**Дуброўскі** Алег Анатольевіч // Памяць. Чашніцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: М. Ц. Дробыш [і інш.] ; уклад. Н. Т. Кіндзяева ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Беларуская навука, 1997. — С. 464—465.

## Дуброўскі Алег Анатольевіч

Нарадзіўся 2 жніўня 1965 г. у саўгасе «Пераможац» Кармілаўскага раёна Омскай вобл. Рускі. Член ВЛКСМ. Бацькі, Вера Фёдараўна і Анатоль Аляксандравіч, рабочыя. У 1982 г. Алег скончыў Заслонаўскую сярэднюю школу, потым Лепельскае ПТВ Віцебскай вобл. У маі 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Лепельскім РВК. Служыў у Афганістане. Радавы А. А. Дуброўскі загінуў 22 снежня 1985 г. Пахаваны ў в. Тараскі Чашніцкага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

*…У той дзень танкавае падраздзяленне выконвала баявое заданне. Танк А. А. Дуброўскага наскочыў на процітанкавую міну. Увесь экіпаж загінуў…*